**Зелянкевіч Л.В. (Мядзел)**

## Лексіка колераабазначэння ў творчасці Максіма Танка

Творчая спадчына Максіма Танка – не проста цікавая старонка нашай літаратуры, у ёй невычэрпная скарбніца думак і пачуццяў, адбітак жывога чалавечага хвалявання. Яна, як цудоўны дыямент, блішчыць фарбамі і адценнямі для чулых сэрцам, для тых, каму дарагая сапраўдная паэзія. Яго паэзія – шматколерная, радуе і чаруе нас багацейшай і шчодрай гамай, яе адценнямі.

Адметнай рысай творчасці многіх пісьменнікаў, у тым ліку і Максіма Танка, з’яўляецца выкарыстанне эмацыянальна-псіхалагічных, эстэтычных магчымасцей лексікі колераабазначэння. Свет, колер цесна звязаны з жыццём чалавека, яны суправаджаюць нас усюды, дапамагаюць найбольш дакладна адчуць стан сузіраемых прадметаў, ствараюць настрой. “Колеры ўздзейнічаюць на душу: яны могуць выклікаць пачуцці, абуджаць эмоцыі і думкі, якія нас супакойваюць або хвалююць, яны засмучваюць або радуюць”, – некалі сказаў Гётэ.

Асаблівасцю творчай манеры Максіма Танка з’яўляецца імкненне як мага дакладней перадаць колеравую характарыстыку, зафіксаваць усе магчымыя адценні. Адпаведна свайму ўспрыманню колеру ён стварае арыгінальныя моўныя адзінкі. Так, складаную колерную характарыстыку выконваюць прыметнікі:

Нямала зор апала ў Нарач шэрай восенню,
Шмат згасла іх начамі цёмнымі, глыбокімі…
Часамі вецер <u>цёмна-сінім</u> невадам
Ловіць іх густымі падвалокамі… [3, с. 88]

Часта сустракаюцца складаныя прыметнікі, першая частка якіх абазначае колер, а другая называе прадмет, які гэтым колерам характарызуецца:

Беларусь, ты ўжо <u>беласнежную</u>
Пэўна заўтра спаткаеш вясну.
Так хацеў бы цябе і бязмежныя
Нівы песняй яшчэ ўскалыхнуць! [3, с. 85]

Асаблівай выразнасці, эмацыянальнасці паэт дасягае за кошт таго, што іншы раз адносіць прыметнік да назоўніка, які звычайна з ім не спалучаецца (жоўты шум, белы цень, сіні начлег і інш.). Таксама выразнасці дадае выкарыстанне складаных прыметнікаў, якія спалучаюць у сабе адценні двух колераў. У зборніку “На этапах” яны выглядаюць незвычайна, але дапамагаюць адчуць усе адценні настрою твора:

Зара на плоце іскрамі затлела,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і вецер закульгаў у каласох,
а на страсе чубатай пачарнелай
расцвіў расою <u>жоўта-сіні</u> мох [3, с. 125].

Метафарычнае выкарыстанне прыметнікаў колеру – з’ява заканамерная, гэта сведчыць аб аўтарскім колераадчуванні.

У зборніку “На этапах” Максім Танк часта ўжывае чорны колер і спалучэнні “хмары, шум, скібы”. На гэта, пэўна, ёсць свае прычыны: маладосць паэта (яму ў час напісання зборніка было 22–24 гады), яго ўсхваляванне, захопленасць тым, што адбывалася ў Беларусі тых часоў. Чорныя скібы палёў, чорныя пеністыя хвалі Нарачы і Мястра, а пазней і чорныя этапныя дарогі былі калыскай твораў Максіма Танка.

Такім чынам, колера-светлавая гама вершаў у зборніку “На этапах” дае магчымасць сцвярджаць, што Максім Танк – паэт-жывапісец, які выкарыстоўвае вялікую колькасць колераў і іх адценняў. У стварэнні паэтычных вобразаў Максім Танк шырока выкарыстоўвае моўна-выяўленчыя сродкі колераабазначэння: эпітэты (агульнамоўныя, індывідуальна-аўтарскія, народна-паэтычныя, выяўленчыя, лірычныя), метафары, параўнанні, сімвалы.

Эпітэт – адзін з актыўных стылістычных сродкаў у творчасці паэта. Амаль у кожным вершы абавязкова сустракаем па-народнаму простае і ёмістае слова. Паэт ужывае эпітэты, калі таго патрабуе змест выказвання, каб паўней ахарактарызаваць прадмет, з’яву, выказаць свае адносіны да іх.

Агульнамоўныя эпітэты:

Цягнуцца думы баразнамі,
<u>чорны</u> змываючы пот,
дзе загарэўся з бярозамі
<u>золатам сіні ўсход</u> [3, с. 7].

Індывідуальна-аўтарскія эпітэты вызначаюцца арыгінальнасцю, самабытнасцю аўтарскага ўжывання.

Гаварыў аб <u>сіняй далі</u>
і аб тых арлах,
што ў баю няроўным палі, палі ў ланцугах [3, с. 61].

Народна-паэтычныя эпітэты ўводзяць чытача ў характэрную атмасферу вуснай народнай творчасці:

Працадзілі праз невад мы возера ўсё,
як далонь, помнім дно і затокі…
дзе балота, пясок, <u>лес зялёны</u>, трысцё… [3, с. 20]

Выяўленчыя эпітэты выдзяляюць адметныя рысы апісваемага прадмета ці з’явы, пры гэтым ацэначны элемент адсутнічае:

А месяц у <u>чорным павуцінні</u>,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

злавіўшы зоры, нібы злодзей,
спусціўся сцежкай цёмна-сіняй
і ціха ў траснікі заходзіць [3, с. 63].

У лірычных эпітэтах, насупраць, прама выражаны адносіны аўтара да апісваемага:

Гаварыў ён аб няболі, –
слухала дзіця –
аб мазолях і аб долі
чорнага жыцця [3, с. 61].

Дзякуючы творам Максіма Танка наша літаратура адкрыла эстэтыку змяркання, вечара, начнога і зімовага быцця. Метафара ў творах паэта – выразны сродак эмацыянальна-пластычнага адлюстравання з'яў прыроды.

Ноч, спужаўшыся, белая ноч над зямлёю,
зорнаю сцежкай адходзіць – чорны кот крадучыся…
Сны, што мінулі, што засталіся са мною,
з ценьмі бяроз спадарожных спляліся [3,с. 104].

Уводзячы ў творы параўнанні, Максім Танк шырока карыстаецца колерам, што дае вобразныя і жывапісныя малюнкі рэчаіснасці. Паэт знаходзіць вельмі трапныя, высокамастацкія, самабытныя, вобразныя параўнанні, узяўшы на ўзбраенне амаль увесь арсенал фарбаў.

А сфінкс усё стаяў і глядзеў на Усход,
на путы, што нёс спрацаваны народ,
на гора, што вечна, як шэры туман,
зямлю заблытала, на зор караван –
глядзеў на крыштальны іх ціхі паход [3, с. 54].

Выкарыстоўваючы ўсё багацце фарбаў, эмацыянальна-псіхалагічныя, эстэтычныя магчымасці лексікі колераабазначэння, Максім Танк змог стварыць цудоўны, непаўторны ў сваёй прыгажосці паэтычны свет.

Літаратура

1. Арочка, М. Максім Танк: жыццё ў паэзіі / М. Арочка. – Мінск, 1984.
2. Бугаёў, Д. Паэзія Максіма Танка / Д. Бугаёў. – Мінск, 2003.
3. Танк, М. На этапах / М. Танк. – Мінск, 1983.
4. Танк М. Збор твораў : у 6 т. / М. Танк. – Мінск, 1978.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ